Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкевіцкая сярэдняя школа»

# ГУЛЬНЯ – ВІКТАРЫНА
# “НАШЫ СІМВАЛЫ”

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Праграмныя задачы: фарміраваць уяўленне аб краіне Рэспублікі Беларусь, сталіцы Мінску, абласных гарадах, аб прыродных сімвалах Беларусі (хвоя, зубр, бусел, кветка васілька, канюшына); развіваць цікавасць да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь (сцяг, герб, гімн), паказваць на карце геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь; выхоўваць патрыятычныя пачуцці: прыхільнасць да роднага краю, гонар за родную краіну.

Матэрыял і абсталяванне: макет геаграфічнай карты Рэспублікі Беларусь, пазл 2шт., карта Рэспублікі Беларусь, фотавыявы прыродных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, музычнае суправаджэнне муз. В. Алоўнікава, сл. А. Бачылы “Радзіма мая дарагая”, эмблемы каманд, мультымедыйнае абсталяванне, выявы прыродных сімвалаў, каляровыя алоўкі, медалі для ўзнагароджання.

Папярэдняя праца: знаёмства дзяцей з дзяржаўнымі і прыроднымі сімваламі Рэспублікі Беларусь, з яе геаграфічным размяшчэннем, завучванне вершаў аб роднай краіне.

Ход занятку:

Гучыць муз. В. Алоўнікава, сл. А. Бачылы “Радзіма мая дарагая”.

Выхавальнік:

-Дзеці, а што гэта за музыка гучыць у нашай групе? (Адказы дзяцей)

-Што такое Радзіма? (Адказы дзяцей)

У кожнага з нас ёсць Радзіма - гэта тая краіна, дзе мы нарадзіліся і выраслі. Важна, каб з маленства мы любілі і ведалі край, дзе жывем, ганарыліся за сваю краіну.

-Дзеці, сёння я запрашаю вас прыняць удзел у віктарыне "Нашы сімвалы”

Сядайце на стульчыкі і паслухайце правіла віктарыны.

У нас ёсць дзве каманды. Кожная каманда выбрала назву і капітана.

Першая каманда "Васількі", (прадстаўляем удзельнікаў, другая каманда "Зубры", (прадстаўляем удзельнікаў).

Правілы для ўдзельнікаў віктарыны.

Я будуць задаваць вам пытанні, і даваць розныя заданні. Для таго каб адказаць, капітану каманды трэба падняць сцяжок, з месца крычаць нельга. Хто першы падняў сцяжок, тая каманда і адказвае. Калі адказ не правільны, адказвае іншая каманда. За кожны правільны адказ вы атрымаеце зорку.

Выйграе каманда, якая набрала большую колькасць зорак.

1 тур «Размінка»

За кожны правільны адказ гульцы атрымліваюць адну зорку.

«Пытанні-адказы»

1. Як правільна называецца дзяржава, у якой мы жывем? (Рэспубліка Беларусь)

2. Хто з'яўляецца прэзідэнтам нашай краіны? (А. Г. Лукашэнка)

3. Нзавіце дзяржаўныя сімвалы нашай краіны? (Сцяг, герб, гімн)

4. Які горад з'яўляецца сталіцай нашай Рэспублікі? (Мінск)

5. Колькі абласных цэнтраў у нашай краіне? (6)

6. Якая мова з'яўляецца роднай для беларусаў? (Беларуская)

7. З якімі краінам мяжуе Рэспубліка Беларусь (Расія, Украіна, Літва, Латвія, Польшча)

8. Назаві назвы абласных гарадоў нашай краіны (Мінск, Магілёў, Гомель, Гродна, Брэст, Віцебск)

9. Які від транспарту ёсць толькі ў Мінску? (Метро)

10. З якіх кветак складзены дзяржаўны сцяг Беларусі? (Чырвоны, зялёны)

Выхавальнік:

2. Тур «Хто хутчэй?»

Дзеці па чарзе замацоўваюць вобласці Рэспублікі на мальберце.

За правільна выкананае заданне каманда атрымлівае адну зорку.

1. Дзве каманды за роўны адрэзак часу павінны сабраць карту Рэспублікі Беларусь з абласцей.

Выхавальнік:

3. Тур «Літаратурны рынг»

Усе гульцы атрымліваюць па адной зорцы.

Гучыць музыка

1. Па два гульцы з каманд чытаюць вершы пра нашу Радзіму.

Карта роднай Беларусі

Разглядаем<br>
Мы з Марусяй<br>
Карту<br>
Роднай Беларусі.<br>
Колькі сёлаў тут,<br>
Гарадоў!<br>
Колькі рэчак<br>
І лясоў!<br>
Вадаёмаў жа,<br>
Азёраў<br>
Быццам тых<br>
На небе зорак.<br>
Што й казаць:<br>
Багаты край<br>
І прыгожыя -<br>
Чым не рай?

Кастусь Жук

Мой край

Куды ні зірні — лясы шумяць,<br>
Цвіце над полем гай,<br>
А поле - вокам не абняць,<br>
І гэта ўсё - мой край!<br>
Пшаніца, жыта на палях,<br>
Усюды ўраджай.

Стагі, як горы на лугах,
І гэта ўсё - мой край!
Куды ні зірні — лясы шумяць,
Цвіце над полем гай,
А поле вокам - не абняць
І гэта ўсё - мой край!
П. Панчанка
Беларусь
Беларусь - мая краіна!
Беларусь - мая Дзяржава!
Беларусь - мая Айчына!
Беларусі маёй слава!
Хай жыве народ магутны,
Ты вялікі мой народ!
Белатвары, залатакудры прыгожы як восход!
Дзеці, вы любіце гуляць? (Адказы дзяцей)
Я запрашаю дзве камандзе ўстаць у круг, і крыху пагуляць.
Маларухомая гульня
«Добры дзень, свет»
Прывітанне, свет. (рукі наверх)
Гэта я! (на грудзі)
А вакол краіна мая! (раскінуць)
Сонца ў нябёсах гарыць (наверх)
І зямля ля ног - ляжыць! (нахіл)
Там - лясы! (павярнуцца направа)
А там - палі! (павярнуцца налева)
Тут - сябры (паварот галавы)
І тут сябры. (направа і налева)
Добры дзень, дом - ты самы лепшы (нахіл уніз)
Прывітанне, край родны магутны! (нахіл уверх)
Добры дзень, краіна мая! (рукі ўверх)
Добры дзень, свет, а вось і я!
4. Тур «Трэці лішні»
Дзеці, якія справіліся з заданнем, атрымліваюць адну зорку.
Выхавальнік: дзеці, вам трэба раскласці ўсе выявы на тры групы :
1. Дзяржаўныя сімвалы "Рэспублікі Беларусь"
2. Прыродныя сімвалы "Рэспублікі Беларусь"
3. Не з'яўляюцца сімваламі "Рэспублікі Беларусь"

Дзеці, вы справіліся з гэтым заданнем, правільна расклалі па групах усе дзяржаўныя і прыродныя сімвалы нашай краіны, выбралі карцінкі, якія не з'яўляюцца сімваламі.

5. Тур «Дарысуй»
Дзеці, якія справіліся з заданнем, атрымліваюць адну зорку.
Выхавальнік:

У гэтым туры вам трэба дамаляваць і размаляваць сімвалы нашай краіны. Дзеці, якія справяцца з заданнем, заробяць па адной зорцы для сваёй каманды.

Цяпер вазьміце па адным аркушы, намалюйце па кропках прыродны сімвал Рэспублікі і размалюйце яго.

Выхавальнік: дзеці, давайце паглядзім, якія малюнкі ў вас атрымаліся.

Вам спадабалася прымаць удзел у віктарыне?

Пра што была наша віктарына?

Як яшчэ можна назваць Рэспубліку?

Якое пачуццё адчуваеце да сваёй Радзімы?

Дзеці, вы - будучыня нашай Радзімы. Калі вы станеце дарослымі, атрымаеце прафесію. Вы станеце добрымі лекарамі, настаўнікамі, інжынерамі, прадаўцамі. Вы будзеце працаваць і сваімі дасягненнямі праслаўляць нашу Радзіму.

А зараз прыйшоў час падвесці вынікі віктарыны.

Давайце паглядзім, колькі зорак набрала кожная каманда.

(Узнагароджанне ўдзельнікаў)

Выхавальнік:

Нажаль, час нашай віктарыны скончыўся. Дзеці, вы былі актыўнымі ўдзельнікамі віктарыны.

Дзякуй за ўдзел.